Жанна ВЕРЫЧ, в. Пінкавічы, Пінскі раён

## Крыж у Вішавічах

*Паданне раскажу для вас адно.*
*Было гэта даўным-даўно…*
*Пакутавала кожная хаціна:*
*Бо гінула ўсякая скаціна.*
*Падзёж жывёлы ў вёсках*
*пракаціўся,*
*І на падворку кожным*
*прыпыніўся.*
*Марнелі дзеці без кароўкі,*
*Слабелі, як ад галадоўкі.*
*Пра тваражок пазабывалі,*
*Ды маслабойкі пуставалі.*
*А без каня ды без вала*
*Зусім не ўявіць сяла.*
*Хутка запасы знікнуць хлеба…*
*Жанкі маліліся да неба!*

*Пачута Богам усё было!*
*З'явіўся старац у сяло.*
*Каб мор жывёлы прыпыніць,*
*За ночку крыж сказаў зрабіць.*
*Яшчэ параіў воін Божы*
*Саткаць за ноч ручнік*
*прыгожы,*
*Павесіць ранкам на крыжы*
*З малітвай: «Божа, памажы!»*
*Памехаю была прычына:*
*За ночку выткаць –*
*немагчыма.*
*Аднак Марыя, вішаўлянка,*
*Узялася, выткала да ранку.*

*Паўстаў уранку крыж дубовы.*
*На ім – ручнік прыгожы, новы.*
*Той старац нездарма з'явіўся,*
*Падзеж скаціны прыпыніўся!*

*Стаіць да гэтых аж часін*
*Аб тых падзеях напамін.*
*Праўда, жалезны, не дубовы,*
*…А гэта ўжо – аповед новы…*